# АБІТУРЫЕНТ

Дадатак да "Настаўніцкай газеты" 24 сакавіка 2011 года

**Абітурыенту на заметку**
Графік цэнтралізаванага тэсціравання і актуальныя каментарыі спецыялістаў
Стар. 6—7

**Рэкамендацыі, як атрымаць рэкамендацыі:**
міжнароднікам, правазнаўцам, журналістам, мытнікам
Стар. 7

**Стаць студэнтам будзе прасцей**
Пра асаблівасці электроннага залічэння
Стар. 8

**Асцярожна — падробкі!**
Папярэджанне абітурыентам, бацькам, настаўнікам і рэпетытарам
Стар. 9

**Аб выніках ЦТ па рускай і беларускай мовах 2010 года**
Заданні па культуры мовы па-ранейшаму самыя цяжкія
Стар. 10—11

**Аналізуючы вынікі рэпетыцыйнага тэсціравання,**
рыхтуемся да цэнтралізаванага
Стар. 12



***Нагадваем абітурыентам, што зарэгістравацца на прафесійна-псіхалагічнае субяседаванне трэба паспець да 31 сакавіка ўключна!***

# “Каб не выглядаць школьніцай”

***Сёння вокладка дадатку “Абітурыент” крыху нестандартная, дакладней, нечаканы выбар гераіні. Гэта не школьніца і не гімназістка, а спецыяліст з 16-гадовым стажам. Ірына Хрыпач, майстар спорту па тэнісе і трэнер, мае намер атрымаць у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь спецыяльнасць “Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка”, каб у далейшым зрабіць кіраўніцкую кар’еру, напрыклад, у сферы спорту і турызму ці ў галіне адукацыі.***

***Можам вас запэўніць, што жыццёвы вопыт і працоўны стаж нікольки не пазбаўляюць хвалявання напярэдадні ўступнай кампаніі. Праўда, яно мае іншы характар. Не жадаючы “выглядаць школьніцай” падчас прафесійна-псіхалагічнага субяседавання, Ірына вырашыла падрыхтавацца да гэтай працэдуры як трэба. І ў Акадэміі кіравання прадаставілі такую магчымасць.***

►►► 6 стар.

# “Каб не выглядаць школьніцай”





◄◄◄ 5 стар.

Калі большасць ВНУ абмяжоўваецца тым, што размяшчае матэрыялы па прафесійна-псіхалагічным субяседаванні (асноўныя патрабаванні, пытанні, якія найчасцей задаюць у камісіях) на ўніверсітэцкіх сайтах, то ў Акадэміі кіравання падышлі да гэтай справы больш грунтоўна — правялі спецыялізаваны семінар для абітурыентаў па тэме “Асаблівасці арганізацыі і правядзення прафесійна-псіхалагічнага субяседавання”.

“Мы зацікаўлены ў тым, каб да нас прыйшлі падрыхтаваныя абітурыенты, каб у іх была дадатковая магчымасць яшчэ раз узважыць свае сілы і зрабіць правільны выбар. Каб у сценах акадэміі яны адчувалі сябе камфортна. Таму мы і вырашылі наладзіць гэтае мерапрыемства”, — патлумачыла дэкан факультэта даўніверсітэцкай падрыхтоўкі акадэміі Ларыса Генадзьеўна Трыгубовіч.

На семінар зарэгістраваліся звыш 140 удзельнікаў — як школьнікаў, так і працуючых спецыялістаў, якія збіраюцца атрымаць другую адукацыю, а таксама студэнтаў старшых курсаў, якія цікавяцца паралельнай адукацыяй. Усе гэтыя катэгорыі абітурыентаў пры паступленні на спецыяльнасці, звязаныя з кіраўніцкай дзейнасцю, павінны прайсці прафесійна-псіхалагічнае субяседаванне. Адмысловыя спецыяльнасці, якія акадэмія прапануе абітурыентам, — “Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка”, “Дзяржаўнае кіраванне і права”.

Якія ж патрабаванні прад’яўляюцца да будучых кіраўнікоў у профільнай вышэйшай навучальнай установе?

“Акадэмія кіравання — унікальная ВНУ з розных пунктаў гледжання. Гэта брэнд, за якім стаіць падрыхтоўка кіраўніцкай эліты, таму нам хацелася б бачыць сярод нашых студэнтаў такіх жа ўнікальных людзей, — зазначыў на семінары прарэктар па вучэбнай рабоце старшыня камісіі па правядзенні прафесійна-псіхалагічнага субяседавання Ігар Іванавіч Ганчаронак. — Першае, што вам трэба даказаць падчас субяседавання, — гэта тое, што вы маеце дастаткова патэнцыял для навучання па тых спецыяльнасцях, на якія прэтэндуеце”.

Прарэктар выказаў некалькі асабістых парад, якія дапамогуць абітурыентам не прамахнуцца пры выбары спецыяльнасці і дастойна прайсці прафадбор. “Выбірайце прафесію, зыходзячы не з рэйтынгаў “Форбс”, а са сваіх прыродных задаткаў і асобасных якасцей, — сказаў ён. — Памятайце, што калі вы выбіраеце дзяржаўную службу, то павінны любіць і паважаць гэтую краіну, ведаць яе гісторыю, сімволіку, законы. Падчас субяседавання будзьце шчырымі і не выдавайце жаданае за сапраўднае. Прадэманструйце свае лепшыя рысы. Будзьце гатовы матываваць, чаму абраная спецыяльнасць важная для вашай будучыні, кар’еры, сям’і”.

З абсалютна прыкладнымі рэкамендацыямі перад абітурыентамі выступіла псіхолаг — загадчыца кафедры псіхалогіі кіравання Н.А.Дубінко. Яна параіла, напрыклад, субяседаванне пачынаць з самапрэзентацыі (як мінімум назваць імя і ўзровень адукацыі), а не моўчкі чакаць пытанняў камісіі. “Як ні цяжка некаторым гаварыць пра саміх сябе — гэтаму трэба вучыцца. Сфармулюйце загадзя некалькі сваіх якасцей, якія характарызуюць вас як будучых паспяховых кіраўнікоў. Не трэба спасылацца на бацькоў і іх уплыў на ваш выбар спецыяльнасці — мы чакаем самастойных маладых людзей”, — заначыла Наталля Аляксандраўна. Псіхолаг нагадала і пра дрэс-код: правіла “сустракаюць па адзежы” ніхто не адмяняў.

Абітурыентам для роздуму: практыка мінулых гадоў паказвае, што ў Акадэміі кіравання адмаўлялі ў рэкамендацыях да 10% удзельнікаў субяседавання.

**Іна НІКІЦЕНКА.**
*nikitsenka@nastgaz.by*
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**

# Графік правядзення цэнтралізаванага тэсціравання ў 2011 годзе

Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 6 ад 21.02.2011 г. зацверджаны графік правядзення цэнтралізаванага тэсціравання ў 2011 годзе.

| № п/п | Прадмет | Дата правядзення | Час пачатку правядзення тэсціравання |
|---|---|---|---|
| 1 | Беларуская мова | 14 чэрвеня, аўторак | 11.00 |
| 2 | Руская мова | 15 чэрвеня, серада | 11.00 |
| 3 | Гісторыя Беларусі | 17 чэрвеня, пятніца | 11.00 |
| 4 | Матэматыка | 19 чэрвеня, нядзеля | 11.00 |
| 5 | Грамадазнаўства | 21 чэрвеня, аўторак | 11.00 |
| 6 | Хімія | 22 чэрвеня, серада | 11.00 |
| 7 | Сусветная гісторыя найноўшага часу | 23 чэрвеня, чацвер | 11.00 |
| 8 | Фізіка | 25 чэрвеня, субота | 11.00 |
| 9 | Біялогія | 26 чэрвеня, нядзеля | 11.00 |
| 10 | Замежныя мовы (англійская, нямецкая, іспанская, французская) | 28 чэрвеня, аўторак | 11.00 |
| 11 | Геаграфія | 29 чэрвеня, серада | 11.00 |

Для абітурыентаў, якія не прынялі ўдзел у цэнтралізаваным тэсціраванні па ўважлівай прычыне ў асноўны дзень, устаноўлены *рэзервовы дзень* — 4 ліпеня (панядзелак).

# “У бой ідуць адны юнакі”

***Адна з асаблівасцей ваеннай адукацыі — сур’ёзны прафесійны адбор абітурыентаў, які ўключае ў сябе медыцынскае абследаванне, а таксама дастатковую фізічную і маральна-псіхалагічную падрыхтаванасць да службы ва Узброеных Сілах. Таму маладым людзям, якія мараць пра ваенную кар’еру, трэба паспяшацца і падаць заяву ў ваенны камісарыят свайго раёна не пазней чым 1 красавіка.***

Як паведамілі нам у прыёмнай камісіі Ваеннай акадэміі, набору дзяўчат у гэтую ВНУ, а таксама на ваенныя факультэты грамадзянскіх ВНУ сёлета не плануецца. Таму “ў бой ідуць адны юнакі”.

Прафесійны адбор будзе ажыццяўляцца ў два этапы. Папярэдні адбор праводзіцца ваеннымі камісарыятамі па месцы жыхарства да 10 красавіка. Канчатковы — камісіямі ваенкаматаў вобласці ці горада Мінска ў перыяд з 10 красавіка да 31 мая.

Зразумела, каб прайсці прафесійны адбор, прэтэндэнтам трэба мець добрае здароўе і дастатковую фізічную падрыхтоўку. Напрыклад, каб атрымаць найвышэйшую адзнаку, юнакам з ліку грамадзянскай моладзі трэба прабегчы стаметроўку за 13,5 секунды, кіламетр — за 3 мінуты і 33 секунды і 13 разоў падцягнуцца на перакладзіне.

Камп’ютарнае тэсціраванне прэтэндэнтаў на прадмет маральна-псіхалагічнай падрыхтаванасці праводзіць Цэнтр псіхалагічных даследаванняў Міністэрства абароны. Як паказвае вопыт мінулых гадоў, гэты этап прафесійнага адбору праходзіць пераважная большасць маладых людзей. І не таму, што патрабаванні зніжаны, а таму, што маладыя людзі, якія дайшлі да гэтага этапу, як правіла, добра падрыхтаваны і маюць высокую матывацыю.

Зрэшты, канчатковае заключэнне пра адпаведнасць прэтэндэнта патрабаванням ваеннай прафесіі прымае камісія ваенкамата вобласці ці горада Мінска. Перадача любога з паказчыкаў прафесійнага адбору не дазваляецца.

**Галіна ГЕНАДЗЬЕВА.**

# Дапаўненне ў Правілах прыёму не ўтрымлівае новых норм,

## *а толькі замацоўвае вынік эксперымента*

***14 сакавіка выйшаў Указ прэзідэнта № 109, якім унесены дапаўненні ва Указ ад 7 лютага 2006 года № 80 “Аб правілах прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы”. У прыватнасці, дакумент тычыцца паступлення абітурыентаў у ВНУ і ССНУ на спецыяльнасці сферы культуры і мастацтва.***

Як пракаменціравала прэс-служба прэзідэнта на сайце кіраўніка дзяржавы, “залічэнне абітурыентаў у Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі і Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў будзе ажыццяўляцца па конкурсе на аснове агульнай сумы балаў, падлічанай па выніках уступнага выпрабавання па прадмеце “Творчасць” і сярэдняга бала сумы балаў, атрыманай па выніках здачы цэнтралізаванага тэсціравання і сярэдняга бала дакумента аб адукацыі”. Мяркуецца, што такая мера дазволіць адабраць у гэтыя ВНУ найбольш творча адораных маладых людзей.

Акрамя таго, прадугледжваецца першачарговае залічэнне на творчыя спецыяльнасці на ўмовах аплаты тых абітурыентаў, якія здавалі ўступны іспыт па прадмеце “Творчасць” альбо выпрабаванне па спецыяльнасці ў гэтай вышэйшай ці сярэдняй спецыяльнай навучальнай установе.

Справа ў тым, што сістэма падліку балаў, якая апісваецца ў каментарыі прэс-службы, не з’яўляецца навінай для дзвюх названых акадэмій. У чым жа заключаецца новаўвядзенне (і ці ёсць яно ўвогуле)? Гэтае пытанне мы задалі кансультанту ўпраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі М.Р.Карпенка.

“На працягу двух апошніх гадоў у творчых ВНУ праводзіўся эксперымент, які меў на ўвазе асаблівую (у адрозненне ад іншых ВНУ) сістэму падліку агульнага бала абітурыента. Сэнс гэтай сістэмы заключаўся ў тым, каб большую “вагу” ў агульнай суме балаў мелі менавіта адзнакі экзамену па прадмеце “Творчасць”. У выніку эксперымента былі зроблены станоўчыя высновы, і цяпер адпаведную норму вырашана зафіксаваць у Правілах прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Іншымі словамі, рэжым эксперымента пераходзіць у нармальны працоўны рэжым”, — пракаменціравала кансультант Міністэрства адукацыі.

**Іна НІКІЦЕНКА.**

***Пералік спецыяльнасцей, пры паступленні на якія трэба прадаставіць рэкамендацыі прафесійна-псіхалагічнага субясядавання, у гэтым годзе не змяніўся: "Дзяржаўнае кіраванне", "Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка", "Міжнародныя адносіны", "Міжнароднае права", "Дзяржаўнае кіраванне і права", "Правазнаўства", "Эканамічнае права", "Журналістыка", "Міжнародная журналістыка" і "Мытная справа". Усе яны падзелены на 5 груп, па кожнай з якіх прад'яўляюцца свае патрабаванні. Магчыма, нашы рэкамендацыі дапамогуць вам сарыентавацца ў гэтых патрабаваннях і, самае галоўнае, канчаткова выбраць спецыяльнасць.***
***(У межах гэтага матэрыялу мы ўпускаем толькі кіраўніцкія спецыяльнасці: аб іх шмат сказана ў матэрыяле "Каб не выглядаць школьніцай".)***

# Рэкамендацыі, як атрымаць рэкамендацыі

## Міжнароднікам

Не адкрыем сакрэту, калі скажам, што на факультэт міжнародных адносін БДУ паступаюць адны з самых моцных абітурыентаў — маладыя людзі з лепшымі вынікамі цэнтралізаванага тэсціравання ў краіне, пераможцы рэспубліканскіх прадметных алімпіяд. Вось прыклады прахадных балаў на бюджэтнае навучанне ў 2010 годзе: на спецыяльнасць "Міжнароднае права" прахадны бал быў 369, на "Міжнародныя адносіны" — 353. Адсюль першая рыса міжнароднікаў — здаровыя амбіцыі.

"Нашы студэнты ўмеюць вучыцца, яны ведаюць, чаго хочуць, маюць вельмі высокую матывацыю, — так характарызуе сваіх студэнтаў дэкан ФМА БДУ В.Г.Шадурскі. — Яны вывучаюць па дзве замежныя мовы (сярод якіх ёсць і рэдкія). У нас вучацца маладыя людзі, якія ўжо ў школьныя гады мелі магчымасць пажыць за мяжой, у асяроддзі носьбітаў мовы, размаўляюць свабодна і без акцэнту, ведаюць розныя моўныя нюансы". Дабаўляем да партрэта наступныя якасці: вялікая ўседлівасць, гатоўнасць прыкладаць да вучобы значныя інтэлектуальныя намаганні і, канечне, здольнасці да вывучэння замежных моў.

Самы непрыемны стэрэатып, які існуе ў грамадскай думцы адносна факультэта міжнародных адносін, быццам ён рыхтуе толькі дыпламатаў для Міністэрства замежных спраў. "Зводзіць міжнародныя адносіны толькі да дыпламатыі — вузка і непрафесійна", — сцвярджае Віктар Генадзьевіч. Не дапусціце падобны "ляп" на субясядаванні!

"Дыпламаты працуюць пераважна ў знешнепалітычных ведамствах — Міністэрстве замежных спраў, у пасольствах, такіх спецыялістаў нашай краіне трэба некалькі чалавек у год, і гэтая колькасць не можа пастаянна павялічвацца. Мы выпускаем кадры для розных міністэрстваў і ведамстваў, прадпрыемстваў, якія займаюцца знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасцю", — падкрэслівае дэкан.

І не забывайцеся, што для працы на знешніх рынках рыхтуюць і іншыя спецыяльнасці. На тым жа ФМА гэта "Сусветная эканоміка","Сучасныя замежныя мовы", "Культуралогія" і іншыя, пры паступленні на якія субясядаванне праходзіць не трэба.

Што да пытанняў, якія вам могуць задаць на прафесійна-псіхалагічным субясядаванні, то яны могуць тычыцца ведання дзяржаўнага ўстройства нашай рэспублікі, органаў дзяржаўнай улады, найбольш важных падзей у жыцці беларускага грамадства; разумення тэрмінаў "права", "абавязкі", "прававая адказнасць", "талерантнасць", "суверэнітэт" і іншых. Акрамя таго, прадугледжаны пытанні аб сучасных міжнародных падзеях.

## Правазнаўцам

На юрыдычным факультэце БДУ расказалі, што ў першую чаргу на субясядаванні выяўляюць матывацыю абітурыентаў, асэнсаванасць іх прафесійнага выбару. Іншымі словамі, пытаюцца, чаму абітурыент вырашыў стаць юрыстам, якія мае планы па заканчэнні ўніверсітэта, кім і дзе хацеў бы працаваць.

"Большасць абітурыентаў прыходзяць з юрыдычных сем'яў, дзе ўжо некалькі пакаленняў юрыстаў, — расказвае дэкан юрыдычнага факультэта БДУ С.А.Балашэнка. — Таму спецыфіку работы правазнаўцаў яны ведаюць, як кажуць, "знутры". Але ёсць і такія, што нагледзеліся серыялаў і мрояць аб прыгожай форме пракурора ці бліскучых выступленнях адваката ў судзе. І толькі ў працэсе вучобы на факультэце яны пачынаюць разумець, што юрыст (ва ўсіх галінах дзейнасці) — гэта штодзённая карпатлівая праца не столькі з людзьмі, колькі з "паперамі" — нарматыўнымі актамі, дагаворамі, прэтэнзіямі, пастановамі".

Па назіраннях членаў камісій, якія ўдзельнічалі ў правядзенні субясядавання ў папярэднія гады, на пытанне аб працы пасля ўніверсітэта распаўсюджаным адказам быў "юрыстам у фірме", прычым часта — ва ўласнай. Многія хочуць быць адвакатамі, "каб ведаць правы і абараняць інтарэсы грамадзян". Дзяўчаты чамусьці імкнуцца працаваць пракурорамі. На юрфаку звяртаюць увагу на тое, што ў апошнія гады большасць паступаючых на факультэт — менавіта прадстаўніцы жаночага полу, што непакоіць і Вярхоўны Суд, і генеральную пракуратуру, і іншыя дзяржаўныя органы: праца ў пракуратуры і судзе вельмі цяжкая і спецыфічная, часта не для жанчын.

Другі блок пытанняў на субясядаванні — прафесійнага плана. Сярод іх, напрыклад, такія: што такое права? якія наступствы могуць мець памылкі юрыста? што такое патрыятызм? што ўяўляе сабой беларуская дзяржаўная сімволіка? як называецца беларускі парламент? што такое суверэнітэт? што такое рэферэндум? калі святкуецца Дзень Канстытуцыі, Дзень незалежнасці? Камісія просіць назваць этапы станаўлення беларускай дзяржаўнасці, выдатных грамадскіх дзеячаў беларускай зямлі, вядомых беларускіх юрыстаў і г.д. Адказы на многія з гэтых пытанняў вы знойдзеце ў падручніках па грамадазнаўстве і гісторыі.

Па словах прадстаўнікоў юрыдычнага факультэта, камісіі настроены вельмі дружалюбна. Галоўнае — не хвалявацца, пажадана расказаць аб сваіх дасягненнях, зрабіць міні-самапрэзентацыю, паказаць добрае валоданне профільным прадметам (грамадазнаўствам), добрую інфармаванасць і веданне грамадска-палітычнай абстаноўкі ў краіне. Камісія таксама звяртае ўвагу на тое, наколькі абітурыенты ўраўнаважаныя і камунікабельныя.

## Журналістам

Пытанні, якія прапаноўваюць у ВНУ будучым журналістам (напрыклад, у Белдзяржуніверсітэце, у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка), можна падзяліць на наступныя блокі: на выяўленне асобасных і дзелавых якасцей, а таксама матывацыі да атрымання журналісцкай прафесіі.

У БДПУ правяраюць слоўнікавы запас, узровень інтэлектуальнага развіцця, камунікабельнасць абітурыента, просяць яго прадэманстраваць лагічна звязаныя адказы, уменне слухаць субяседніка, ацэньваць паводзіны людзей і наступствы сваіх дзеянняў. Пагадзіцеся — неабходныя якасці для журналіста. У матывацыйным блоку камісія высвятляла веданне спецыфікі прафесіі, бачанне перспектыў прафесійнага росту, схільнасць да самакантролю, гатоўнасць працаваць у розных, у тым ліку нестандартных, сітуацыях. Часта члены камісій задаюць пытанні з пункта гледжання слухачоў і гледачоў. "У журналістыку хацелася б бачыць больш кампетэнтных спецыялістаў, што глыбока валодаюць праблемай, якую асвятляюць. І больш пазітыву на тэлеэкранах і ў газетах", — раіць нашым будучым калегам прарэктар па вучэбнай рабоце БДПУ імя Максіма Танка Ю.А.Быкадораў.

У БДУ будучым журналістам у мінулым годзе задавалі наступныя пытанні: што абітурыенты ведаюць аб перыядычным друку, якія чытаюць маладзёжныя выданні і якія глядзяць маладзёжныя тэлепраграмы, як разумеюць тэзіс аб тым, што журналістыка — гэта від творчай дзейнасці, што цікавага могуць расказаць замежніку аб культуры і традыцыях беларускага народа, якія гістарычныя падзеі ў гісторыі Беларусі лічаць самымі важнымі, калі святкуецца Дзень незалежнасці нашай краіны, з якімі дзяржавамі ўсталяваны найбольш трывалыя ўзаемаадносіны і г.д.

## Мытнікам

Па спецыяльнасці "Мытная справа" ў нашай краіне рыхтуюць тры ВНУ: Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, Белдзяржуніверсітэт і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту. Ва ўсіх універсітэтах адзначаюць, што сярод будучых мытнікаў, на жаль, толькі каля 10% прадстаўнікоў мужчынскага полу, хаця органы мытні зацікаўлены менавіта ў мужчынах, паколькі першае патрабаванне ў гэтай прафесіі — моцнае здароўе. Пры камплектаванні штатаў мытных органаў часта дзяўчыны з высокімі паказчыкамі ў вучобе не праходзяць медыцынскую камісію. У выніку Дзяржаўны мытны камітэт недабірае кадры. Тым не менш заканадаўчых абмежаванняў для дзяўчын пры паступленні на гэтую спецыяльнасць няма. Выпускніцы знаходзяць сабе добрую працу, напрыклад, у сферы знешнеэканамічнай дзейнасці.

"Акрамя моцнага здароўя для супрацоўніка мытні вельмі важная грамадзянская пазіцыя: ён павінен падзяляць мэты, якія ставіць Дзяржаўны мытны камітэт, дакладна ўсведамляць антыкарупцыйную накіраванасць яго дзейнасці", — лічыць дэкан факультэта тэхналогій кіравання і гуманітарызацыі БНТУ Г.М.Броўка.

Па яго словах, з дапамогай субясядавання значная колькасць людзей адсейваюцца добраахвотна, нават калі яны і атрымалі допуск да паступлення. Многія задумваюцца над тым, ці адпавядае іх здароўе патрабаванням мытнага камітэта, ці цікавыя ім міжнародныя навіны, ці атрымліваецца ў іх быць сумленнымі і дысцыплінаванымі. А магчыма, іх уяўленне аб рабоце мытніка занадта павярхоўнае? "Пажадана, каб на гэтыя пытанні абітурыенты паспрабавалі адказаць для сябе напярэдадні субясядавання", — зазначае Генадзь Міхайлавіч.

**Падрыхтавала Іна НІКІЦЕНКА.**
*nikitsenka@nastgaz.by*

**Важна!**

**Прафесійна-псіхалагічнае субясядаванне праводзіцца пры паступленні на ўсе формы атрымання вышэйшай адукацыі: дзённую, завочную (у тым ліку дыстанцыйную), вячэрнюю, для навучання ў скарочаныя тэрміны, на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, для атрымання другой і наступнай вышэйшай адукацыі. У аднолькавай меры рэкамендацыя субясядавання патрабуецца як для паступаючых на бюджэтную форму навучання, так і на платную.**

# Як пашырыць спектр сваіх магчымасцей

***Звяртаем увагу абітурыентаў, якія збіраюцца праходзіць прафесійна-псіхалагічнае субясядаванне па спецыяльнасцях кіраўніцкага і правазнаўчага профіляў, на тое, што ў складзе названых груп спецыяльнасцей ёсць змяненні.***

Так, спецыяльнасць "Дзяржаўнае кіраванне і права" з групы кіраўніцкіх спецыяльнасцей перанесена ў групу правазнаўчых. Такім чынам, будучыя юрысты, якія будуць мець на руках адпаведную рэкамендацыю, змогуць выбіраць з трох спецыяльнасцей: "Дзяржаўнае кіраванне і права", "Правазнаўства" і "Эканамічнае права". А вось будучым кіраўнікам прапануецца толькі дзве спецыяльнасці: "Дзяржаўнае кіраванне" і "Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка".

"Спецыяльнасці перагрупаваны такім чынам, каб у кожнай групе быў аднолькавы пералік уступных выпрабаванняў", — патлумачыла кансультант ўпраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Марыя Карпенка.

Такім чынам, пытанне аб узаемным прызнанні рэкамендацый страціла сваю актуальнасць, паколькі, скажам, пры паступленні на спецыяльнасці кіравання патрабуецца адзін набор сертыфікатаў цэнтралізаванага тэсціравання, а на правазнаўчыя спецыяльнасці — іншы.

ЦТ, як вядома, можна здаваць не больш чым па трох прадметах. Таму абітурыентам, якія на гэты момант не вызначыліся з прадметамі цэнтралізаванага тэсціравання, раім зарэгістравацца і прайсці прафесійна-псіхалагічнае субясядаванне на некалькіх профілях. Наяўнасць дзвюх ці трох рэкамендацый пашырыць спектр вашых магчымасцей.

Інструкцыя аб парадку правядзення прафесійна-псіхалагічнага субясядавання не забараняе зарэгістравацца хоць на ўсе пяць груп спецыяльнасцей. Нельга іншае — рэгістравацца на субясядаванне па адной і той жа спецыяльнасці адразу ў некалькіх ВНУ. Парушальнікі гэтай нормы будуць праходзіць субясядаванне толькі ў той ВНУ, дзе яны зарэгістраваліся раней.

**Іна НІКІЦЕНКА.**

# План "Б" для ваенных журналістаў

***Працягваючы тэму прафесійна-псіхалагічнага субясядавання, трэба паведаміць, што ўрэгулявана пытанне прыёму абітурыентаў на журналісцкія спецыяльнасці ваенных і цывільных факультэтаў.***

У мінулыя гады абітурыенты, якія паступалі на спецыяльнасць "Ваенная журналістыка" (такая ёсць, напрыклад, на ваенным факультэце Белдзяржуніверсітэта), але недабіралі дастатковай колькасці балаў, не маглі перападаць дакументы на спецыяльнасці "Журналістыка" ці "Міжнародная журналістыка" факультэта журналістыкі, паколькі не мелі рэкамендацыі прафесійна-псіхалагічнага субясядавання.

Зараз абітурыентам спецыяльнасці "Ваенная журналістыка" прапаноўваецца наступны алгарытм дзеянняў. Ім не трэба праходзіць прафесійна-псіхалагічнае субясядаванне ў красавіку, а трэба звяртацца ў ваенкаматы па месцы жыхарства, каб прайсці прафесійны адбор разам з іншымі абітурыентамі ваенных факультэтаў і Ваеннай акадэміі.

Калі падчас уступнай кампаніі высветліцца, што для паступлення на абраную спецыяльнасць не хапае балаў, то ў прыёмнай камісіі ВНУ (а не ў ваенкамаце) трэба ўзяць рэкамендацыю, якая і стане пуцёўкай на аналагічную журналісцкую спецыяльнасць цывільнага факультэта.

Нагадаем, што прыём дакументаў на ваенныя факультэты цывільных ВНУ ажыццяўляецца з 16 па 23 ліпеня, а на ўсе астатнія факультэты — з 16 па 25. Пералік іспытаў аднолькавы і для ваенных журналістаў, і для цывільных (што і дае магчымасць для манеўру): цэнтралізаванае тэсціраванне па беларускай (рускай) мове, гісторыі Беларусі, а таксама іспыт па творчасці.

**Аляксандр АНДРЫЯНАЎ.**

**Летась Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і рыдыёэлектронікі паспяхова правёў электроннае залічэнне абітурыентаў на платнае навучанне, а сёлета ўжо ўвесь набор будзе праведзены па гэтай сістэме. Плануецца, што ў недалёкай будучыні электроннае залічэнне будзе распаўсюджана на ўсю вышэйшую школу краіны, а таму цікавасць да новаўвядзення праяўляюць абітурыенты не толькі БДУІР, але і іншых навучальных устаноў.**
**Каб даведацца пра асаблівасці электроннай сістэмы залічэння, мы звярнуліся да яе распрацоўшчыкаў — спецыялістаў факультэта камп'ютарных сістэм і сетак БДУІР Віталя Русіна і Максіма Міхневіча.**

# Не залежаць ад чужых балаў, а кіравацца ўласнымі інтарэсамі

## *Электронная сістэма залічэння ў ВНУ паспрыяе больш свядомаму выбару будучай прафесіі*

### Спачатку — выбар спецыяльнасці, потым — ЦТ

Такім чынам, сёлета ўсе абітурыенты БДУІР атрымаюць магчымасць пры падачы дакументаў указваць не адну (як было раней), а тры спецыяльнасці ў парадку прыярытэту. "Першапачаткова будзе адбывацца залічэнне на тую спецыяльнасць, якую абітурыент указаў першай, скажам, на спецыяльнасць А. Калі ён не праходзіць сюды па конкурсе, то аўтаматычна будзе ўдзельнічаць у конкурсе на спецыяльнасць В. У выпадку няўдачы абітурыент мае магчымасць прэтэндаваць на спецыяльнасць С", — тлумачыць Віталь Генадзьевіч Русін.

Згодна з Правіламі прыёму, залічэнне ў ВНУ праходзіць у некалькі этапаў, і абітурыенты маюць магчымасць удзельнічаць у кожным з іх (у адпаведнасці з вызначанымі прыярытэтамі): спачатку на дзённую форму бюджэтнага навучання, потым — на завочную бюджэтную форму і нарэшце — на ўмовах аплаты на ўсе формы навучання, у тым ліку і на вячэрнюю. Такім чынам, верагоднасць таго, што за бортам застануцца добра падрыхтаваныя абітурыенты, істотна памяншаецца.

Акрамя таго, распрацоўшчыкі звяртаюць увагу на выражаную прафарыентацыйную скіраванасць электроннай сістэмы залічэння. "Зараз большасць абітурыентаў паступаюць не туды, куды



**Віталь Русін:**
"Задача новай сістэмы — зрабіць прыём яшчэ больш празрыстым для абітурыентаў".

сапраўды хочацца, а па прынцыпе "абы на бюджэт!", — гаворыць Максім Валер'евіч Міхневіч. — На жаль, сёння рэдка каго хвалюе, будзе ён праграмістам, сістэматэхнікам ці інжынерам-механікам. Ён параўноўвае свае балы з іншымі, бачыць, што праходзіць па конкурсе, і падае дакументы, не задумваючыся асабліва над тым, што яго чакае ў гэтай спантанна выбранай прафесіі. Пасля таго як праходзіць першая эйфарыя — "я паступіў на бюджэт!" — многія хапаюцца за галаву, бо разумеюць, што не пра гэта яны некалі марылі…"

Сёлета абітурыенты БДУІР будуць падаваць дакументы ва ўніверсітэт, ужо маючы на руках сертыфікаты ЦТ. А ў будучыні, калі будзе існаваць адзіная электронная сістэма залічэння, мяркуецца, што выбар спецыяльнасцей абітурыенты будуць рабіць загадзя, на этапе рэгістрацыі на ЦТ. Вядома, яны і ў гэтым выпадку будуць спрабаваць пралічыць свае шансы на паступленне і пастараюцца выбраць найбольш верагодныя для сябе варыянты. Але вельмі важна, што пры гэтым у іх будзе дастаткова часу, каб падумаць над тым, якія прафесіі ім сапраўды даспадобы, і зрабіць свядомы выбар.

### Прыём стане яшчэ больш празрыстым для абітурыентаў

Плануецца, што распрацаваная ў БДУІР электронная сістэма залічэння ў будучыні перарасце ў глабальную інфармацыйную сістэму, якая будзе дзейнічаць у рамках усёй краіны. У ёй будуць задзейнічаны не толькі ВНУ, але і Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў, школы і іншыя навучальныя ўстановы, якія даюць дакументы аб адукацыі.

Ужо сёння распрацоўваецца канцэпцыя будучай сістэмы, якая будзе дзейнічаць па прынцыпе аднаго акна, што павінна максімальна спрасціць жыццё абітурыентам. Схематычна гэта выглядае наступным чынам: абітурыент піша заяву, дзе ўказвае пералік спецыяльнасцей у парадку прыярытэту, здае цэнтралізаванае тэсціраванне па абраных прадметах і чакае запрашэння на вучобу. Пасля гэтага яму ў вызначаны тэрмін трэба падаць дакументы ў ВНУ і аформіць залічэнне.

Вядома, дэталі адзінай электроннай сістэмы залічэння будуць яшчэ абмяркоўвацца, але папярэдне плануецца, што яшчэ да пачатку рэгістрацыі на ЦТ школы павінны пачаць фарміраваць адзіную абітурыенцкую базу даных. На спецыяльным сайце ў вызначанай форме будуць уносіцца асабістыя даныя абітурыентаў: прозвішчы, адрасы, пашпартныя звесткі…. Зараз БДУІР уносіць прапанову ў Міністэрства адукацыі, каб школы самі падлічвалі сярэдні бал і ўносілі яго ў атэстаты сваіх выпускнікоў. Потым гэта дазволіць школам, мінуючы прыёмныя камісіі ВНУ, самім унесці сярэдні бал кожнага свайго выпускніка ў адзіную абітурыенцкую базу.

Такі падыход істотна спрашчае рэгістрацыю абітурыентаў на ЦТ: на той час кожны з іх ужо ёсць у базе, і аператару давядзецца ўнесці толькі мінімум інфармацыі. Па-першае, гэта прадметы цэнтралізаванага тэсціравання, і па-другое, спецыяльнасці, што выбірае абітурыент, у парадку перавагі. Перападача дакументаў таксама будзе адбывацца даволі хутка, супрацоўнікам прыёмнай камісіі дастаткова ўнесці ў адзіную абітурыенцкую базу патрэбныя карэктывы.

Колькасць спецыяльнасцей, якія можна заявіць для паступлення, будзе яшчэ абмяркоўвацца. Сёлета БДУІР прапаноўвае сваім абітурыентам тры спецыяльнасці на выбар. Але камп'ютарная праграма працуе такім чынам, што дастаткова змяніць лічбу ў настройках — і спецыяльнасцей можа быць любая іншая колькасць (прычым можна ўказаць не толькі бюджэтнае, але і платнае навучанне па любой форме ў любой ВНУ).

Вельмі важна, што кожны абітурыент на спецыяльным сайце можа бачыць сваю асабістую справу. У адзіную базу будуць уносіцца вынікі цэнтралізаванага тэсціравання, а таксама звесткі аб выбраных спецыяльнасцях і залічэнні.

"Задача новай сістэмы — не ўскладніць, а спрасціць, зрабіць прыём яшчэ больш празрыстым для абітурыентаў, таму ўся інфармацыя будзе абавязкова адлюстроўвацца ў інтэрнэце, — гаворыць Віталь Русін, — хаця звесткі аб ходзе прыёму дакументаў і, адпаведна, аб конкурсах на абраныя спецыяльнасці будуць усё ж некалькі абмежаванымі, бо статыстыку можна атрымаць толькі па той спецыяльнасці, якая стаіць першай у ліку прыярытэтаў. Таму нягледзячы на максімальную празрыстасць прыёмнай кампаніі, інтрыга захаваецца".



**Максім Міхневіч:**
"Удачу трэба "лавіць" на цэнтралізаваным тэсціраванні".

### Хто выйграе ва ўмовах электроннага залічэння?

Па-першае, выйграе ўніверсітэт, які атрымлівае магчымасць прыняць самых моцных абітурыентаў. Раней, нават маючы 300 балаў, абітурыент мог застацца за бортам, калі "не ўгадваў" спецыяльнасць. Цяпер гэта наўрад ці магчыма.

Такім чынам, па-другое, выйгралі і самыя моцныя абітурыенты, якія атрымалі значную свабоду ў выбары спецыяльнасці. Маючы высокі бал, можна пралічыць варыянт (хаця б трэці ў ліку прыярытэтаў), каб паступіць з высокай верагоднасцю.

### Каму не пашанцавала?

Можна меркаваць, што ў будучыні некаторыя ВНУ будуць мець праблемы з наборам студэнтаў на непрэстыжныя спецыяльнасці. Зразумела, што, маючы выбар, абітурыенты будуць шукаць найбольш прывабныя для сябе варыянты. Гэта звычайная сітуацыя пры такой сістэме залічэння, таму распрацоўшчыкі сістэмы закладваюць у праграму правядзенне новых ітэрацый (паўтарэнняў), калі пасля залічэння ўсіх абітурыентаў аб'яўляецца паўторны набор.

Думаецца, не пашанцавала і тым, хто пры звычайнай сістэме залічэння мог разлічваць найперш на ўдачу, а не на веды. І раней шчаслівыя выцягвалі той адзіны білет, які ведалі, і зараз камусьці ўдаецца ў апошні момант "удала" перападаць дакументы. Пры новай сістэме залічэння элемент удачы адыходзіць на другі план (калі толькі трэцяй спецыяльнасцю ў ліку прыярытэтаў не выбраць тую, куды ніхто не хоча паступаць).

"Ну якая гэта ўдача? — бегаць з аднаго ўніверсітэта ў другі і шукаць праход?! — не пагаджаецца са мной Максім Валер'евіч Міхневіч. — Куды лепш спакойна сядзець дома за камп'ютарам і сачыць за сітуацыяй. А галоўнае, што пры такой сістэме людзі будуць выбіраць спецыяльнасці, на якіх ім хочацца вучыцца, а не тыя, куды ўдалося прайсці".

### Ільгота на паступленне — не заўсёды на карысць!

Сёлета пры залічэнні на ўсе формы навучання ў БДУІР будуць улічвацца ўсе абітурыенцкія льготы, захаваецца таксама асобны конкурс для сельскіх і гарадскіх абітурыентаў. Аднак тут ёсць адна праблема. Яна звязана не з тэхнічнымі магчымасцямі сістэмы — сюды якраз можна закласці любыя ўмовы, а з фармалізацыяй ільгот, стварэннем адзіных дакументаў.

"Мы ўпэўнены, што сацыяльныя льготы павінны быць не на этапе паступлення, а на этапе вучобы — стыпендыя, іншая фінансавая дапамога, інтэрнат, — гаворыць Віталь Русін. — У нас ёсць выпадкі, калі льготнікі паступалі на прэстыжную спецыяльнасць па 3—5 разоў. Так, мы залічваем іх, але яны вучацца адзін семестр, завальваюць першую ж сесію… і летам паступаюць зноў. Натуральна, што калі прахадны бал на факультэт — 300, то людзі з сотняй балаў не могуць вытрымаць зададзенага тэмпу, але льгота для паступлення ў іх ёсць і яны ёй карыстаюцца, займаючы, на жаль, месцы вельмі моцных абітурыентаў. Хаця зразумела, што і для гэтых людзей было б лепш, каб яны выбралі спецыяльнасць згодна са сваёй падрыхтоўкай і атрымалі прафесію ў тэрмін".

* * *

Відавочна, што самай каштоўнай абітурыенцкай ільготай з'яўляюцца добрыя веды. І ў сістэме электроннага залічэння гэтая льгота спрацоўвае бездакорна.

Галіна СІДАРОВІЧ.
sidarovich@nastgaz.by
Фота Алега ІГНАТОВІЧА.

**Класічны выраз "усякі попыт заўсёды нараджае прапанаванне" вельмі добра стасуецца з працэсам падрыхтоўкі абітурыентаў да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.
Мы са свайго боку толькі вітаем розныя формы падрыхтоўкі да ўступных экзаменаў. Калі ўзровень ведаў абітурыентаў па тым ці іншым прадмеце павышаецца, то і ранжыраванне іх у час цэнтралізаванага тэсціравання будзе, зразумела, больш якаснае.**

# Асцярожна — падробкі!

## *Папярэджанне абітурыентам, бацькам, настаўнікам і рэпетытарам*

### Вышэйшая адукацыя — для ўсіх!

Трэба сказаць, што ў апошнія гады атрыманне вышэйшай адукацыі з'яўляецца адным з асноўных прыярытэтаў моладзі, і пра гэта вельмі яскрава сведчыць статыстыка: штогод каля 90% выпускнікоў сярэдніх школ удзельнічаюць у цэнтралізаваным тэсціраванні. Павелічэнне колькасці жадаючых здаць уступныя экзамены звязана, на наш погляд, яшчэ і з працэдурай праходжання цэнтралізаванага тэсціравання.

Існуючыя ўмовы дазваляюць маладым людзям пазбегнуць некаторых даволі сур'ёзных праблем, якія былі да ЦТ. Так, напрыклад, у адрозненне ад папярэдняй, так званай традыцыйнай, формы ўступных іспытаў абітурыент зараз можа праэкзаменавацца не толькі ў сталіцы ці абласным цэнтры, але і ў асобных гарадах, размешчаных паблізу яго месца жыхарства. Немалаважнае значэнне мае тое, што ў перыяд паступлення адпадае неабходнасць уладкавання ў інтэрнат ці пошуку кватэры. Акрамя таго, некаторых абітурыентаў можа задаволіць невысокі вынік здачы экзаменаў. У такім разе, не паступіўшы на бюджэтную форму навучання, яны маюць перспектыву атрымаць дыплом, фінансуючы выдаткі на вучобу з уласнай кішэні. Ёсць, безумоўна, і іншыя перавагі ў такой формы ўступных іспытаў, як цэнтралізаванае тэсціраванне.

У параўнанні з мінулым часам, прыкладна дваццацігадовай даўнасці, сённяшні культ вышэйшай адукацыі прыводзіць да больш высокага конкурсу сярод абітурыентаў, а высокі конкурс, у сваю чаргу, патрабуе ад паступаючых грунтоўнай падрыхтоўкі, такой, якая забяспечыць ім месца ў ВНУ. Нярэдка, спрабуючы апраўдаць нізкую канкурэнтаздольнасць слаба падрыхтаваных абітурыентаў, іх бацькі робяць памылковую выснову: школа вучыць не зусім добра; і вынікі будуць добрыя толькі тады, калі за справу возьмецца рэпетытар.

### Чаму ў рэпетытараў заўсёды аншлаг?

На жаль, не раз даводзілася ды і зараз даводзіцца чуць меркаванне, што без рэпетытара паступіць наогул нельга. Мы згодны з тым, што выкладчык з высокай прафесійнай падрыхтоўкай, які пры гэтым яшчэ і добра валодае прыёмамі індывідуальнай працы з абітурыентам, мае перавагу перад школьным настаўнікам. Апошні праводзіць урокі ў класе, дзе займаюцца больш як 25 вучняў. Але давайце спытаем сябе: ці зможа рэпетытар, няхай і пры самых адказных адносінах да сваёй справы, за паўгода ці нават за год перыядычных сустрэч з вучнем замяніць 10—11 гадоў вывучэння матэматыкі, мовы і іншых прадметаў у школе? Адказ, як нам здаецца, відавочны. Крыху ўпарадкаваць атрыманыя ў школе веды зможа, навучыць асобным прыёмам работы ў абставінах, блізкіх да тых, што будуць на экзамене, — таксама. А вось цалкам замяніць школу, якая забяспечвае атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, і школьнага настаўніка, які на працягу многіх гадоў вучыць, — не.

Больш за тое, ні для каго не сакрэт, што эфектыўны рэпетытар (чые вучні на тэсціраванні атрымліваюць высокія вынікі) зацікаўлены не толькі ў плацежаздольнасці бацькоў, але і ў добрай школьнай падрыхтоўцы сваіх падапечных. Такіх вучняў намнога прасцей рыхтаваць да экзаменаў, у такіх вучняў намнога больш шансаў атрымаць высокія балы. А пры станоўчых выніках і бацькі застануцца маральна задаволены, думаючы, што іх грошы "не выкінуты на вецер". І імідж рэпетытара захаваецца, і яму не трэба будзе турбавацца пра набор навучэнцаў на наступны год. Заўсёды аншлаг.

Хочацца звярнуць увагу яшчэ на адну важную акалічнасць. Колькасць месцаў у ВНУ папярэдне ўстанаўліваецца ў адпаведнасці з планам сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Таму памыляецца той, хто лічыць, што чым вышэйшыя агульныя вынікі цэнтралізаванага тэсціравання, тым больш абітурыентаў стануць студэнтамі. На самай жа справе ў такім выпадку больш высокі будзе конкурсны (прахадны) бал на запланаваныя месцы, а іх колькасць у вышэйшых навучальных установах для першакурснікаў, як правіла, застаецца нязменнай.

Так, у апошнія гады ВНУ набіралі крыху больш за 30 тысяч студэнтаў для навучання за кошт бюджэтных сродкаў і больш за 70 тысяч — для навучання на платнай аснове. Усяго ж у цэнтралізаваным тэсціраванні штогод прымалі ўдзел больш за 170 тысяч абітурыентаў. Як паказваюць суадносіны паміж лічбамі, пры любым раскладзе вынікаў уступных іспытаў адукацыю ў вышэйшых навучальных установах змаглі прадоўжыць толькі крыху больш за 100 тысяч абітурыентаў.

### "Armani" кітайскага пашыву

Апрача рэпетытарства, у апошнія гады абітурыентам усё часцей прапаноўваюцца самыя розныя выданні як надзейныя дапаможнікі ў падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання. Калі звярнуць увагу на разнастайнасць найменняў і тыражы гэтых выданняў, то становіцца зразумела, што попыт на іх вялікі.

Аднак нельга не адзначыць яўнага па колькасці перакосу ў бок дапаможнікаў, якія не вучаць, а толькі кантралююць веды будучых абітурыентаў. Сярод апошніх пераважаюць выданні, якія па форме падачы матэрыялу і фармулёўках да заданняў, па колькасці заданняў у адным блоку (тэсце) і па правяраемых элементах зместу прадмета максімальна набліжаны да тэстаў Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў. Вось такі "Armani" кітайскага пашыву!

Каб чытач не здзіўляўся такому скептычнаму параўнанню, дазволім сабе пракаменціраваць некаторыя моманты адносна гэтых выданняў.

Зразумела, пры ўмове, калі ўсё патрэбна хутка, многія ўдзельнікі працэсу падрыхтоўкі да ўступных экзаменаў забываюць удакладніць, наколькі дапаможнікі, якія сёння знаходзяцца на прылажках кнігарань, адпавядаюць устаноўленым Міністэрствам адукацыі нормам.

Калі ёсць попыт, будзе і прапанаванне. Так, зусім нядаўна выдавецтва "ТетраСистемс" распаўсюдзіла праз гандлёвую сетку краіны серыю "Пробное тестирование дома". Адрасаваны гэты, пададзены ў прыгожым канверце, "Индивидуальный комплект тренировочных материалов для подготовки к централизованному тестированию" шырокаму колу чытачоў: абітурыентам, бацькам, настаўнікам, рэпетытарам.

Возьмем для разгляду адзін "комплект" з гэтай серыі па рускай мове (аўтар Л.М.Мормыш). Па форме падачы матэрыялу заданні максімальна набліжаны да тэставых заданняў Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў. Магчыма, каб прывабіць пакупнікоў падобнай структурай, магчыма, каб стварыць уражанне, што гэта матэрыялы нашага інстытута. І ўсё ж, нягледзячы на знешняе падабенства заданняў "комплекта" з заданнямі, якія прапаноўваюцца на ўступных іспытах, трэба адзначыць наступнае:

не ўвесь матэрыял "комплекта" адпавядае школьнай праграме і праграме ўступных іспытаў. Сёння, напрыклад, не зусім карэктна ўжываць тэрмін "придаточное предложение". У дзеючай вучэбнай праграме падаецца тэрмін "придаточная часть предложения";

у заданнях прапаноўваецца вялікая колькасць слоў-выключэнняў, малаўжывальных лексічных адзінак;

не пазбаўлены заданні варыятыўнасці. Працяжнік у няпоўных сказах, прапанаваных аўтарам, ставіцца факультатыўна. У словах "договор" і "тотчас" у адпаведнасці з апошнімі арфаэпічнымі нормамі (гл. слоўнікі Аванесава і Рэзнічэнкі) пастаноўка націску варыятыўная;

іншыя падыходы да складання заданняў сталі прычынай іншага ў параўнанні з тэставымі заданнямі РІКВ узроўню складанасці і як вынік — тэста наогул;

іншая ступень увагі да раздзелаў курса. Так, веданне правіл напісання зычных аўтарам правяраецца толькі з дапамогай матэрыялаў трох заданняў, галосных — з дапамогай двух. Некаторыя тэмы з раздзела "Арфаграфія" не прадстаўлены зусім. Няма заданняў на праверку сінтаксічных норм.

Шкада, калі асобныя рэпетытары замест таго, каб выкарыстаць вынікі рэпетыцыйнага тэсціравання нашага інстытута як дыягнастычную карту і зрабіць аналіз допушчаных памылак, адсылаюць абітурыентаў да сумніўных дапаможнікаў.

Вы спытаеце, чаму нас гэта хвалюе?

Па-першае, абсалютная большасць абітурыентаў, якія карыстаюцца выданнямі такога кшталту, упэўнены, што яны з'яўляюцца нейкім эталонам будучых тэстаў цэнтралізаванага тэсціравання. Пра гэта сведчыць пошта абітурыентаў, якія ўказваюць на неадпаведнасць заданняў "комплектов пробного тестирования дома" заданням цэнтралізаванага тэсціравання.

Па-другое, карыстаючыся такой "метадычнай" літаратурай, абітурыент можа дэзарыентавацца ў вызначэнні асноўных падыходаў пры падрыхтоўцы да ўступных экзаменаў, можа няправільна дыягнаставаць свае прамежкавыя веды па прадмеце.

Па-трэцяе, у многіх грамадзян складваецца памылковае ўяўленне аб перагружанасці тэстаў цэнтралізаванага тэсціравання выключэннямі, малаўжывальнымі словамі, аб наяўнасці ў іх варыятыўных напісанняў, аб іх неадпаведнасці вучэбнай праграме і г. д.

Акрамя пералічаных, вышэй указаныя "комплекты" маюць яшчэ адзін істотны недахоп: узоры бланкаў адказаў аўтарам падаюцца па-іншаму: паказаны сімвалы і знакі, якія звычайна не выкарыстоўваюцца ў бланках адказаў цэнтралізаванага тэсціравання. Гэта нязначная на першы погляд змена можа стаць прычынай блытаніны пры запаўненні абітурыентамі бланкаў адказаў падчас ЦТ.

Выклікаюць пытанні і міфічныя каэфіцыенты складанасці тэставых заданняў, якія прыводзіць аўтар "комплекта", прапаноўваючы абітурыенту вызначыць свой бал пасля выканання тэста. Пры гэтым 24(!) прадстаўленыя ім заданні маюць аднолькавы ўзровень складанасці — 2,61.

Да ведама аўтара "комплекта": каэфіцыенты складанасці і колькасць балаў за кожнае заданне, выкананае на ЦТ, устанаўліваюцца камп'ютарнай праграмай пасля апрацоўкі бланкаў адказаў, запоўненых абітурыентамі. Як аўтар вырашыла гэтае пытанне, зразумець немагчыма. Аднак зразумела іншае: пры вызначэнні выніку выканання тэста з "комплекта" абітурыент атрымае нейкую абстрактную лічбу, якая не пакажа яго ўзровень падрыхтоўкі для здачы ЦТ.

### "Гандаль на асфальце"

Гандаль прапаноўвае сёння шмат цікавай і карыснай літаратуры для падрыхтоўкі да ўступных экзаменаў. І ўсё ж, калі выдавецтвы і асобныя аўтары ў рознага роду дапаможніках імітуюць рэпетыцыйнае тэсціраванне з парушэннем тэхналогіі шкаліравання вынікаў іспытаў і займаюцца імправізацыяй зместу экзаменацыйнага матэрыялу, то мы лічым неабходным папярэдзіць аб гэтым тых, каму адрасаваны падобныя матэрыялы, — "абитуриентов, родителей, учителей, репетиторов".

Такія дапаможнікі вельмі нагадваюць несертыфікаваныя адпаведнымі службамі прадукты харчавання, што прапаноўваюць дробныя гандляры з "прылаўкаў" на асфальце на падступах да мінскай Камароўкі.

Адным словам, дзе прываблівы пакупнік, там і тавар на розны густ. А вось які набываць — выбіраць спажыўцу.

**Мікалай ФЯСЬКОЎ,**
**дырэктар**
**Рэспубліканскага інстытута**
**кантролю ведаў.**

**P.S.:** Матэрыял ужо быў падрыхтаваны да друку, калі ў інстытут патэлефанавала ўзбуджаная маці выпускніцы адной са сталічных школ. Справа ў тым, што яе дачка падчас рэпетыцыйнага тэсціравання на трэцім этапе па матэматыцы атрымала толькі 6 балаў. Да ўступных экзаменаў засталіся лічаныя тыдні, а тут такі вынік!

Бацькі ў такім выпадку перш за ўсё думаюць пра магчымыя памылкі падчас апрацоўкі і шкаліравання тэставых работ у нашым інстытуце. Яно і зразумела — дачка з пачатку навучальнага года руплiва працуе з рэпетытарам.

Мы таксама ўважліва ставімся да такіх зваротаў бацькоў. А раптам на самай справе дзесьці адбыўся збой у камп'ютарнай праграме?

Між тым паўторная праверка паказала, што дзяўчына правільна выканала толькі тры заданні з трыццаці. На жаль, для будучай абітурыенткі трэці этап рэпетыцыйнага тэсціравання быў першым знаёмствам як з тэставымі заданнямі, так і з тэхналогіяй запаўнення бланкаў адказу.

***У чарговым выпуску "Абітурыента" прапануўваем асобныя нататкі з каментарыямі заданняў і аналізам памылак, дапушчаных абітурыентамі падчас цэнтралізаванага тэсціравання ў 2010 годзе. Пры захаванні пераемнасці з тэставымі матэрыяламі папярэдніх гадоў матэрыялы 2010 года маюць пэўнае адрозненне.***

# Самы высокі вынік

## *паказваюць выпускнікі гімназій*

